УДК 821.161.3.09

**А.М. Макарэвіч (Магілёў)**

# “ПАЛЕСКІЯ РАБІНЗОНЫ” ЯНКІ МАЎРА І “АФГАНСКАЯ ШКАТУЛКА” АНАТОЛЯ ФЕДАРЭНКІ: АСАБЛІВАСЦІ ПРЫГОДНІЦКАГА МАСТАЦКАГА СВЕТУ

**Аннотация**. Повести «Полесские робинзоны» Янки Мавра и «Афганская шкатулка» Андрея Федоренко рассматриваются в контексте формирования (Янка Мавр) и развития (Анатолий Федоренко) традиций белорусской приключенческой, познавательной литературы для детей и подростков.

**Summary**. The story «Palesse’s Robinsons» by Yanka Maur and the story «Afghanistan’s box» by Andrey Fedorenko are considered in the context of formation (Yanka Maur) and development (Andrey Fedorenko) of the Belarusian adventure, informative literature for children and teenagers.

архив библиотеки МГУ имени А

Аповесць "Палескія рабінзоны" (1929) Янкі Маўра[1] адносіцца да ліку прыгодніцкіх твораў у беларускай дзіцячай літаратуры. У аповесці адлюстраваны незвычайныя прыгоды падлеткаў, якія аказаліся на затопленым паводкай лясным востраве на Палессі.

Галоўныя героі твора – навучэнцы тэхнікума Мірон Бажок і Віктар Каляга, якія "*мелі абодва разам гадоў трыццаць пяць*" [1, с. 7].

Пісьменнік "перадаў" сваім героям некаторыя з уласных дзіцячых і юнацкіх захапленняў і мар. Хлопцы "*чыталі шмат кніжак, асабліва прыгодніцкіх – Жуля Верна, Майна Рыда, Купера і г.д. Цікавілі іх розныя далёкія краіны, дзікуны, індзейцы, якіх цяпер бадай ужо зусім няма*" [1, с. 8].

У той жа час Янка Маўр звяртае ўвагу на тую асаблівасць юнацкіх захапленняў, якая ўласцівая многім падлеткам: імкнуцца да чужога прыгожага і незвычайнага, не звяртаючы ўвагу на такое ж сваё. Мірон і Віктар "*марылі пра пальмы, джунглі, а не бачылі добрай пушчы, якая была за некалькі дзесяткаў кіламетраў ад іх <…> Марылі пра мора, караблі, а не бачылі вялікага возера, якое ляжала за кіламетраў дваццаць ад іх*" [1, с. 8]. Пісьменнік пераконвае сваіх чытачоў у тым, што ў нас на Беларусі "*шмат куткоў, не горшых ад заморскіх*" [1, с. 8].

І вось аўтар аповесці дае нагоду сваім героям непасрэдна не толькі сутыкнуцца з незвычайнай роднай прыродай (яе раслінным, жывёльным, птушыным светам), а і спазнаць яе таямніцы, прыгажосць, а галоўнае – залежнасць чалавека ад гэтай самай прыроды, з якой некалі выйшлі яго продкі. Мірон і Віктар, якія вырашылі у час вясенніх канікул здзейсніць падарожжа на чоўне ў затопленую паводкай частку Палескай пушчы ўсяго на некалькі дзён, затрымліваюцца там на некалькі тыдняў. Яны, якія па сваёй няўважлівасці страцілі човен, аказваюцца ў своеасаблівым "палоне" не толькі затопленага паводкай вялікагаляснога вострава, а і бандытаў-кантрабандыстаў. Пісьменнік у гэтым творы паказвае не толькі кароткую дарогу сваіх юных герояў да гэтага "палону", а і доўгі шлях выйсця з яго. Гэты шлях мае дзве таямнічыя і складаныя для хлопцаў часткі. Першая – навучанне выжыванню сярод прыроды, не маючы дзеля гэтага нічога, акрамя ўласных рук, ног, вопраткі і невялікага жыццёвага вопыту ў спалучэнні з ведамі, атрыманымі з падручнікаў, мастацкай літаратуры. Другая частка гэтага шляху – змаганне за жыццё, пра пагрозу якому з боку бандытаў-кантрабандыстаў (яны зрабілі гэты закінуты востраў сваёй базай) хлопцы даведаліся выпадкова, імкнучыся знайсці дапамогу ў гэтых людзей, што нечакана і таямніча з'явіліся на востраве.

Першую частка шляху хлопцаў з "палону" вострава можна вызначыць як пазнавальную ў невядомых і неспрыяльных умовах. Яны дзеля выжывання вучацца здабываць і захоўваць полымя, харч, ладзіць і ўдасканальваць жытло, вырабляць прылады "хатняй" гаспадаркі і інш. Гэты "паўтарыцельны" курс вопыту, пакінутага старажытным чалавекам і зафіксаванага ў падручніках, хлопцы прайшлі з вялікімі цяжкасцямі і ў той жа час паспяхова. Другая частка шляху Мірона і Віктара з "палону" вострава – прыгодніцкая. Пасля таго, як хлопцы трохі асвоіліся ў прасторы гэтай закінутай мясцовасці, навучыліся выжываць ва ўмовах адсутнасці выгод цывілізаванага жыцця, пачалі настойліва шукаць выхад праз балота да людзей, то менавіта сустрэча з людзьмі азмрочыла іх настрой і пошукі. Пасля дзесяці дзён выжывання на нібыта абсалютна бязлюднай тэрыторыі "*палескія рабінзоны*" спачатку сутыкнуліся з прыкметай прысутнасці на востраве людзей (знайшлі свежы недакурак), а пасля і з самімі наведвальнікамі гэтай закінутай часткі Палесся: бандытамі-кантрабандыстамі. Як падслухалі хлопцы, бандыты вырашылі з імі фізічна расправіцца як з магчымымі сведкамі іх злачыннай дзейнасці. Пасля гэтага пачынаецца найбольш напружаная частка аповесці, прыгодніцкія элементы якой спалучаюцца з дэтэктыўнымі. Мірон і Васіль, даведаўшыся пра планы кантрабандыстаў, пачынаюць не толькі сачыць за імі, калі тыя імкнуліся знайсці хлопцаў, а і ўключаюцца ў своеасаблівы працэс даследавання загадкавага з'яўлення гэтых узброеных людзей на востраве. На працягу каля двух тыдняў падлеткі шляхам разважанняў, назіранняў, абследавання тэрыторыі вострава імкнуцца высветліць абставіны і мэты з'яўлення тут двух загадкавых і ваяўніча настроеных у адносінах да іх "*незнаёмцаў*". Канфлікт у дадзеным выпадку будуецца на сутыкненні відавочнай невінаватасці падлеткаў і злачынных намераў супраць іх бандытаў.

Пасля адыходу "*смяротных ворагаў*" з вострава Мірон і Віктар не губляюць дарэмна часу. Яны знаходзяць у баброваой хатцы сховішча кантрабандных тавараў, зброю, дыверсійныя карты. Ранейшыя "*ваенныя заняткі ў гуртку*" надалі ўпэўненасці хлопцам: маючы рэвальверы, яны ўжо маглі не толькі абараніць сябе, а і, магчыма, затрымаць бандытаў. Дзеля гэтага "*рабінзоны*" арганізавалі назіральны і ў той жа час абарончы пункт. Пасля доўгіх дзён напружанага і "*бясконцага чакання*" (кантрабандысты меркавалі вярнуцца на востраў праз два тыдні), падрыхтоўкі да сустрэчы са "*смяротнымі ворагамі*" хлопцы нарэшце ўбачылі іх. Але не адных: з імі былі яшчэ два хаўруснікі і палонны (як высветлілася потым – вайсковец пагранатрада). Кемлівыя падлеткі вызваляюць у час адсутнасці бандытаў палоннага Андрэя Саўчука і ўжо разам яны абяззбройваюць і бяруць у палон бандытаў. Паперы, якія "*рабінзоны*" раней знайшлі ў бабровай хатцы і перадалі пагранічнікам, яшчэ болей засведчылі важнасць зробленай падлеткамі справы.

У канфлікце паміж Міронам, Віктарам і кантрабандыстамі перамагаюць розум, арганізаванасць, вынаходлівасць, смеласць хлопцаў, урэшце – сацыяльная справядлівасць, якая была надзённай не толькі для перыяду стварэння аповесці, а і цяперашняга часу. Эстэтычнае значэнне аповесці заключаецца, акрамя іншага, у патрыятычным яе гучанні, а таксама ў адлюстраванні ў гэтым творы адной з экалагічных праблем: захаванне жывёльнага свету, які бессардэчна знішчаецца (варта пры гэтым прыгадаць эпізод забойства бандытамі зубра і перажыванні ў сувязі з гэтым хлопцаў-вандроўнікаў).

Аповесць "Палескія рабінзоны" – гэта твор, што знаходзіцца ля вытокаў беларускай дзіцячай прыгодніцкай літаратуры. Традыцыі гэтай часткі прыгожага пісьменства для дзяцей першай трэці XX ст. прасочваюцца і ў сучаснай беларускай дзіцячай літаратуры, напрыклад, у прыгодніцкіх аповесцях Андрэя Федарэнкі[2] "Шчарбаты талер" (1999) і "Афганская шкатулка" (2002).

"Афганская шкатулка" – твор, у якім развіваюцца некалькі прыгодніцкіх ліній у рэтаспекцыйным і рэальным плане, сыходзячыся потым у адзіную сюжэтную плынь. Значную ролю пры гэтым выконвае вобраз апавядальніка, які выконвае функцыю не толькі ўзнаўляльніка пэўных падзей, а формаўтваральную функцыю. Веды апавядальніка пра гісторыю і яе герояў вызначаюцца шырынёй, усебаковасцю; ён прапаноўвае ўзнаўленне падзей з розных бакоў: праз пераказ падзей мінулага ад свайго імя, ад імя Барыса Крушынскага, доктара Пратасевіча. Для пацвярджэння падзей цяперашняга часу апавядальнік "накіроўвае" чытача ў мінулае, вызначае часавую працягласць пэўных здарэнняў і інш. –

[1] Янка Маўр – класік беларускай дзіцячай літаратуры, заснавальнік новых тэм і жанраў у гэтай частцы нацыянальнага прыгожага пісьменства. Пісьменнік адкрываў для юных чытачоў 1920–1950-х гг. свет невядомых краін, адлюстроўваў барацьбу каланіяльных народаў супраць сацыяльнага прыгнёту і сутнасць гэтага прыцяснення (раман "Амок", аповесці "У краіне райскай птушкі", "Сын вады", апавяданне "Слёзы Тубі", "Незвычайная прынада", "Лацароні" і інш.), паказваў розныя праявы жыцця, захапленні, мары юнакоў, дзяцей з замежных краін (аповесць "Сын вады") і з савецкай дзяржавы (аповесці "Палескія рабінзоны", "ТВТ", апавяданні "Бярозавы конь", "Падарожжа вакол дома", "На крызе", "Шапка" і інш.), ствараў фантастычны свет вандровак, тэхнічных планаў і іх здзяйснення (адпаведна: казка "Вандраванне па зорках", аповесць "Фантамабіль прафесара Цылякоўскага") і інш.

[2] Андрэй Федарэнка – лаўрэат Літаратурнай прэміі імя Івана Мележа (1995, за кнігу «Смута»). Яго творы друкаваліся на беларускай, англійскай, нямецкай, рускай, латышскай, славацкай, украінскай мовах. Міхась Тычына ахарактарызаваў гэтага пісьменніка як творцу, які "*натуральным чынам увайшоў у шэраг беларускіх класікаў*". "*Жывых літаратараў рэдка так называюць, аднак Федарэнку можна лічыць класікам, які жыве і шмат працуе ў адзін з намі час*" [3].

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

такім чынам апавядальнік ідзе па шляху супастаўлення падзей мінулага з розных пазіцый іх удзельнікаў. У выніку гэтага чытач аказваецца, натуральна, больш дасведчаным у параўнанні з дзецьмі (Цімам, Валікам, Вікай), якія імкнуцца разгадаць таямніцу з'яўлення у іх мясцовасці загадкавых людзей (Крушынскага, доктара Пратасевіча і інш.).

Падзеі, што разгортваюцца ў аповесці "Афганская шкатулка", выкліканы пошукамі афганскай шкатулкі, якую некалі пераправіў і захаваў у Беларусі былы афганец Барыс Крушынскі. Дзеці – героі твора – знарок аказваюцца ў сітуацыі раскрыцця таямніцы. Менавіта Цім, Валік і Віка высачылі злачынцаў і дапамаглі следчым органам вызваліць з-пад турэмнага арышту былога афганца, абвінавачанага ў злачынных намерах.

Прыгоды галоўных герояў гэтага твора ў пераважнай большасці разгортваюцца як вынік іх уласнай пошукавай і "следчай" ініцыятывы. Пісьменнік у сувязі з гэтым адлюстроўвае гэтыя прыгоды, грунтуючыся найперш на асаблівасцях дзіцячага ўспрымання свету, яго загадак і таямніц. Такі аспект мастацкай мадэлі прыгодніцкай гісторыі (як, дарэчы, стыль і форма яе рэпрэзентацыі) выклікае ў некаторай часткі дарослых рэцыпіентаў непрыманне[3]. Яны ацэньваюць прыгоды дзяцей з гэтага твора, як і з Маўравых "Палескіх рабінзонаў", "вачыма" спрактыкаванай свядомасці дарослага чалавека. Пісьменнікі ж (Маўр, Федарэнка) ішлі па шляху стварэння прыгодніцкага свету, які быў бы цікавы найперш дзецям, дастаткова лёгка і камфортна імі ўспрымаўся. Пра гэта сведчыць не толькі стыль твораў, а і будова іх (напрыклад, у пачатку раздзелаў абодва пісьменнікі прапаноўваюць тэзісныя анатацыі да іх). Апошняе своеасабліва актуалізуе адну з дыдактычных функцый гэтых твораў: у пачатку раздзела адбываецца своеасаблівая мэтавая ўстаноўка на ўспрыманне адпаведных падзей. Болей за тое, калі ўлічыць, што гэтыя аповесці могуць разглядацца ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі ў якасці твораў для дадатковага чытання, то можна сцвярджаць, што такая іх асаблівасць спрые больш эфектыўнай падрыхтоўцы вучняў да характарыстыкі адпаведных эпізодаў, частак твора, іх праблематыкі і герояў. Пры гэтым варта звярнуць увагу на той факт, што Янка Маўр пэўны час працаваў у якасці настаўніка; ён імкнуўся развіваць не толькі пазнавальныя схільнасці сваіх вучняў, а і іх аналітычныя здольнасці (што, дарэчы, пасняхова адлюстравана ў "Палескіх рабінзонах" – інтэлектуальна-практычныя разважанні Мірона і Віктара). У сувязі з гэтым пісьменнік-педагог, відаць, і выкарыстаў адпаведную структуру твора: сукупнасць раздзелаў-здарэнняў і кароткіх анатацый да іх. Такая форма ўласцівая і іншым яго творам: аповесцям "Чалавек ідзе", "У краіне райскай птушкі", "Сын вады", раману "Амок" і інш.

Паказальна, што прыгодніцкія элементы ў "Палескіх рабінзонах" Янкі Маўра і "Афганскай шкатулцы" Андрэя Федарэнкі спалучаюцца з пазнавальнымі: у першым з названых твораў – гэта прыродапазнавальны (раслінны, жывёльны, птушыны свет) і краязнаўчапазнавальны (свет Палесся), у другім – гісторыкапазнавальны (эпізоды вайны ў Афганістане і яе ўплыву на лёсы канкрэтных людзей).

Пэўнае падабенства ў гэтых творах назіраем і ў асаблівасцях стварэння і раскрыцця характараў галоўных герояў аповесцей: Віктара і Мірона ("Палескія рабінзоны"), Ціма і Валіка ("Афганская шкатулка"). Гэтыя падлеткі не проста сябры. Яны ў іх сяброўстве, з аднаго боку, узаемна дапаўняюць адзін аднаго з пункту погляду ведаў, жыццёвай пазіцыі і небагатага вопыту, падлеткавай "мудрасці" і інш., з другога, супрацьстаяць адзін аднаму сваімі адпаведнымі прыгодніцкім сітуацыям пазіцыямі і памкненнямі. Апошняе з'яўляецца своеасаблівай рухаючай сілай у развіцці сюжэту абодвух гэтых твораў.

Такім чынам, аповесці "Палескія рабінзоны" Янкі Маўра і "Афганская шкатулка" Андрэя Федарэнкі – гэта прыгодніцкія творы для дзіцячага чытання з элементамі дэтэктыву. Яны, акрамя іншага, маюць цікавы для дзяцей пазнавальны і выхаваўчы змест. Такі змест, нягледзячы на высокі ўзровень інфармаванасці сучасных школьнікаў, можа быць эфектыўна выкарыстаны на ўроках па творах для дадатковага чытання, творчых работ як прыдатны падмурак для (адпаведна) вусных і пісьмовых разважанняў вучняў адносна такіх эстэтычных праблем, як чалавек і прырода, перспектыва выбару і сам выбар, вайна і лёс чалавека, гуманнае і антыгуманнае ва ўчынках людзей і інш.

*ЛІТАРАТУРА*


1. **Маўр, Я.** Збор твораў : у 4 т. / Янка Маўр. – Мінск : Маст. літ., 1976. – Т. 4. – С. 5–156.
2. Отзыв: Книга "Афганская шкатулка" – Андрей Федоренко – а я так надеялся на автора-земляка [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://otzovik.com/review_1167582.html. – Дата доступу: 01.12.2015.
3. Міхась Тычына: «Андрэй Федарэнка ўвайшоў у шэраг беларускіх класікаў» [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://budzma.by/news/mikhas-tychyna-andrey-fyedarenka-wvayshow-u-sherah-byelaruskikh-klasikaw.html. – Дата доступу: 01.12.2015
4. **Федарэнка, А.** Афганская шкатулка : Аповесць, апавяданні / Андрэй Федарэнка. – Мінск : Юнацтва, 2002. – С. 6–162.


[3] Гл., напрыклад, выказванні-ацэнкі адносна зместу, стылю і структуры "Афганскай шкатулкі" аднаго з выпадковых чытачоў [2].

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова